**20 студзеня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрытая **кніжная выстаўка «Зазірнуў у душу стагоддзяў»**, прысвечаная 70-годдзю пісьменніка, перакладчыка Леаніда Дай-

нэкі, лаўрэата Літаратурнай прэміі імя І. Мележа Саюза пісьменнікаў Беларусі, Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя К. Каліноўскага.

Шлях у літаратуру Л. Дайнека пачынаў як паэт, але найбольшую вядомасць яму прынеслі празаічныя творы, у прыватнасці – гістарычныя раманы «Меч князя Вячкі», «След ваўкалака» і «Жалезныя жалуды». На выстаўцы экспануюцца кнігі Л. Дайнэкі і творы, што не друкаваліся асобна, а выйшлі ў часопісах («Герадоцінкі», раман «Назаві сына Канстанцінам» і асобныя вершы), прадстаўленыя пераклады з рускай, украінскай, літоўскай і татарскай моваў. Раздзел «Наватар у жыцці і ў літаратуры» знаёміць з публікацыямі ў энцыклапедычных выданнях і кнігах, якія раскрываюць жыццё і творчасць пісьменніка.